Дз. М. Дубініна
Н. С. Старжынская

# Мастацка-мауленчая дзейнасць у дзіцячым садзе

**Дапаможнік для педагогаў дашкольных устаноў**

*Рэкамендаваны
Навукова-метадычным цэнтрам вучэбнай кнігі
і сродкаў навучання Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь*

Мінск «Народная асвета» 1999

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ДАШКОЛЬНІК І МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА

Мастацкая літаратура займае пачэснае месца ў агульнай сістэме выхавання і навучання дашкольнікаў. Пад яе ўплывам фарміруецца нацыянальны характар, адбываецца станаўленне нацыянальнай самасвядомасці. Праз літаратурныя творы маленькія слухачы, як праз акенца, маюць магчымасць убачыць усю прыгажосць і разнастайнасць навакольнага свету.

Мастацкая літаратура дапамагае дашкольнікам стварыць структуру свайго інтэлекту, устанаўліваць рознага роду сувязі: я і іншыя, я і рэчы. Яна з'яўляецца той невычэрпнай крыніцай духоўнага жыцця, адкуль дзеці атрымліваюць звесткі пра рэальнасць, якую яны яшчэ не ведаюць.

Без перабольшвання можна сказаць, што знаёмства маленькага чалавека з кнігай — гэта перш за ўсё выхаванне сэрца, далучэнне да чалавечай годнасці, да ўтоеных куткоў чалавечай душы. Без веры, без любві, без усведамлення сваёй неабходнасці, карыснасці чалавек не можа жыць, а дзіця тым больш. Менавіта таму мастацкая літаратура з'яўляецца комплексным сродкам развіцця і выхавання асобы дашкольніка. В. Р. Бялінскі лічыў, што кнігі, якія пішуцца для дзяцей, павінны ўваходзіць у план выхавання як адзін з найбольш значных яго бакоў.

Творы славеснага мастацтва мэтанакіравана і гарманічна фарміруюць маральны і творчы патэнцыял дзяцей дашкольнага ўзросту. Мастацкае слова дапамагае дзіцяці не толькі не згубіць, а нават і далей развіць той, дараваны яму ад самога нараджэння, дар дзяцінства, дзе душа і сэрца накіраваны на іншага чалавека.

Акрамя таго, мастацкі твор выступае для дашкольнікаў і як узор маральных паводзін, скарбніца розных лёсаў і характараў, сімвал чысціні і міласэрнасці. На яго аснове ў дзяцей выхоўваецца прынцыповасць, сумленнасць, сапраўдная грамадзянскасць. Дзіцячая кніга спрыяе паяўленню ў дзяцей пачуцця адказнасці: гэта клопат аб маленькіх, павага да старэйшых. Пад уплы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вам мастацкага твора фарміруецца культура паводзін дзяцей.

Літаратурныя творы малююць перад вачыма дзіцяці ўсю прыгажосць роднай Бацькаўшчыны, выхоўваюць пачуццё вялікай павагі і любві да яе.

Мастацкі твор дае шмат карыснага для разумовай дзейнасці дашкольніка. Пад яго ўздзеяннем ва ўяўленнях маленькага чалавека ўзнікаюць жывыя вобразы, якія дапамагаюць зразумець ідэйны змест. Разам з тым дзіця арыентуецца ў даступных для яго разумення з'явах рэчаіснасці, бачыць у іх новыя, раней не заўважаемыя якасці, набывае разнастайныя веды пра навакольны свет. Кнігі, у якіх даецца пазнавальны матэрыял, задавальняюць цікавасць дзяцей, упарадкоўваюць той вопыт, які быў набыты дашкольнікамі раней.

Мастацкая літаратура развівае творчыя здольнасці асобы дзіцяці. Найбольш часта гэта праяўляецца ў ролевых гульнях па літаратурных сюжэтах, у інсцэніроўках і драматызацыях, у час выразнага чытання вершаў, у іншых відах мастацка-маўленчай дзейнасці.

Набыты літаратурны вопыт актыўна выкарыстоўваецца дзецьмі ў іх творчай маўленчай дзейнасці, у час самастойнага стварэння апавяданняў, казак, вершаў, загадак і інш.

Разам з тым мастацкая літаратурная творчасць стымулюе развіццё гульнявой дзейнасці дашкольнікаў, уплывае на змест дзіцячых гульняў. Увогуле, гульнявую дзейнасць і мастацкую творчасць збліжае тое, што яны выклікаюцца задавальненнем, якое дастаўляе сам працэс творчасці, працэс гульні.

Разам з мастацкім словам уваходзіць у жыццё дзіцяці і добры мастацкі жарт. З яго дапамогай у дашкольнікаў выхоўваецца і развіваецца пачуццё гумару. На яркіх літаратурных прыкладах з дапамогай гумару дзіця хутчэй вылечваецца ад ляноты, упартасці, эгаізму.

У працэсе слухання літаратурных твораў у дашкольнікаў назіраецца асаблівая цікавасць да гучання мастацкага слова. Яны адчуваюць яго рытмічнасць, мілагучнасць, вобразнасць, заўважаюць і паўтараюць вобразныя выразы, удалыя і трапныя параўнанні. К. Чукоўскі, які з асаблівай увагай ставіўся да развіцця дзіцячага маўлення, сцвярджаў, што маленькія дзеці ўвогуле валодаюць асаблівым моўным чуццём. Гэта ў першую чаргу пацвярджаецца іх імкненнем да рытміч-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ных словазлучэнняў, мілагучных вершаў, апавядальных казак, бадзёрага скандзіравання лічылак і заклічак. Той факт, што разам са зместам літаратурных твораў дашкольнікаў цікавяць некаторыя элементы іх мастацкай формы, дае магчымасць гаварыць, што радасць, якая праяўляецца дзецьмі пры слуханні мастацкіх твораў, сведчыць аб здольнасці дашкольнікаў да эстэтычнага ўспрымання мастацтва слова.

Знаёмства дзяцей з кнігай суправаджаецца глыбокім пранікненнем у духоўныя вытокі роднай мовы. Жадаючы зразумець твор, дзіця адначасова стараецца зразумець і словы, з якіх гэты твор складаецца, усвядоміць іх структуру. Менавіта мастацкая літаратура з'яўляецца вызначальнай асновай развіцця ў дзіцяці мілагучнага і трапнага роднага слова.

Роля і значэнне мастацкай літаратуры яшчэ больш павялічваецца ў сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму. Яна з'яўляецца адным з найбольш эфектыўных сродкаў навучання першапачатковым навыкам разумення беларускай мовы, паступовага папаўнення і замацавання слоўнікавага запасу, а таксама ўзнаўлення пачутага на роднай мове.

Мастацка-маўленчыя заняткі, на якіх адбываецца знаёмства з мастацкай літаратурай, выступаюць для дашкольнікаў як узор правільнага беларускага маўлення. Эстэтычнае ўспрыманне мастацкага твора суправаджаецца знаёмствам дзяцей з пэўным суадносеннем лексічных адзінак, асаблівасцямі дзеяслоўнага кіравання і г. д. Акрамя таго, на такіх занятках дзеці вучацца слухаць не толькі чытанне ці расказванне выхавальніка, але і паступова набываюць навыкі гаварэння, гэта значыць узнаўлення раней пачутага, у час якога адбываецца развіццё актыўнага слоўніка і засваенне разнастайных граматычных формаў.

Але мастацкая літаратура выконвае сваё прызначэнне выхоўваць і ўсебакова развіваць дзяцей толькі тады, калі пры ўспрыманні твора праяўляюцца пачуцці, узнікаюць думкі, калі твор прыносіць эстэтычнае задавальненне. Разам з выхаваннем высокай мастацкасці і духоўнасці літаратурныя творы з'яўляюцца першакрыніцай навучання дашкольнікаў роднай мове. Яркія вобразы, трапныя словы і выразы мастацкай літаратуры закладваюць у дзецях асновы любві да роднай мовы, да роднай прыроды, да свайго народу, да Айчыны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ЗМЕСТ


Дашкольнік і мастацкая літаратура . . . . . . . . . . 3

Асаблівасці ўспрымання твораў мастацкай літаратуры дзецьмі дашкольнага ўзросту . . . . . . . . . . . . . . . 6

Кола дзіцячага чытання . . . . . . . . . . . . . . . 13

Азнаямленне дашкольнікаў з творамі мастацкай літаратуры 16

Навучанне дашкольнікаў выразнаму чытанню вершаў і баек 27

Пераказванне казак і апавяданняў . . . . . . . . . . 37

Драматызацыя і інсцэніраванне мастацкіх твораў . . . 46

Развіццё выразнага і вобразнага маўлення дашкольнікаў . 53

Навучанне творчаму расказванню . . . . . . . . . . . 60

Прыкладныя гульнявыя комплексы па развіццю выразнага маўлення старэйшых дашкольнікаў . . . . . . . . . . 70



Вучэбнае выданне

Мастацка-маўленчая дзейнасць
у дзіцячым садзе

Дапаможнік для педагогаў дашкольных устаноў


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ